**В. И. Калинин,** ***Загадка балтийских цыган: Очерки истории, культуры и социального развития балтийских цыган*****, Минск: И. П. Логинов, 2005, сс. 204.**

Апошнія два дзесяцігоддзі ў Еўропе вызначаюцца актывізацыяй увагі да праблем нацыянальных меншасцей. Значнае фінансаванне атрымліваюць праекты, якія звязаныя з даследаваннем праблемы цыганоў, пытаннямі іх сацыяльнай адаптацыі, развіцця адукацыі, выхавання і т.п. На гэтым даследаванне гісторыі цыганоў на Беларусі не вызначаецца значнай колькасцю прац. Вядома, што першым пра іх згадаў П. Шпілеўскі ў сваім „Падарожжы па Палессю і Беларускаму краю", у дваццатыя гады XX ст. у часопісе „Наш край" пра гэты народ пісаў Т. Даўгяла. У найноўшай беларускай гістарыяграфіі можна назваць артыкулы Л. Дучыц, Т. Буйко, А. Фрыдмана і В. Калініна.

Таму я не магу перадаць задаволенасці ад выхаду ў свет кнігі Вальдэмара Калініна „Загадкі балтыйскіх цыганоў", якая па сутнасці з'яўляецца першым комплексным аглядам гісторыі цыганоў на тэрыторыі Балтыйскага рэгіёна. У нарысах сістэматывазаны значны матэрыял архіўных крыніц і літаратуры па гісторыі балтыйскіх цыганоў ад першых пісьмовых згадак аб іх да сучаснасці. Чытач знойдзе адказы на пытанні хто такія цыганы, адкуль яны прыйшлі, на якой мове размаўляюць, які іх лёс на беларускіх і суседніх землях.

Аўтар імкнецца прывесці асноўныя гіпотэзы аб паходжанні цыганоў, выказвае часам смелыя погляды, якія з'яўляюцца вельмі суб'ектыўнымі. Пры гэтым даследчык больш ставіць пытанні (напрыклад, аб спрэчнасці паходжання цыганоў з тэрыторыі Індыі, адсутнасці звестак аб часе прыняцця імі хрысціянства), чым на іх адказвае, бо „пытанне аб протацыганах не з'яўляецца спецыфічнай тэмай нашай кнігі" (с. 7).

Гісторык справядліва заўважае, што аб цыганах створана шмат міфаў, таму ён „намераны прытрымлівацца фактаў” (с. 7). У далейшым у сямі главах (асобныя з якіх напісаны ў сааўтарстве з А. Падліпскім і Т. Ауэр) даецца агляд гісторыі. Неабходна заўважыць, што перыяду ад першага з’яўлення цыганоў на тэрыторыі Еўропы і да канца XVIII ст. прысвечана толькі адна глава („З Азіі ў Еўропу”). У ёй аўтар вельмі сцісла выкладае асноўныя факты з перыяду сярэднявечча, разважае аб наяўнасці двух галоўных міграцыйных патокаў цыганоў на Балканы і Еўропу („цыганскай” і „егіпецкай”). Асобна разгледжана пытанні з’яўлення цыганоў на землях Польскай дзяржавы, адносін да іх у Вялікім Княстве Літоўскім, ахарактарызавана сістэма цыганскай улады на гэтых землях. Зноў заўважым, што звесткі вельмі агульныя. Тых, хто хоча атрымаць больш інфармацыі адсылаем да даследавання польскага гісторыка Леха Мруза „Дзейнасць цыганоў — ромаў у Рэчы Паспалітай XV-XVIII ст.”

Асобная глава прысвечана агляду гісторыі цыганоў Расійскай імперыі. Аўтар распавядае пра заканадаўчыя акты, якія прымаліся расійскімі імператарамі адносна гэтага народу, аб першым у свеце вялікім цыганскім хоры, які быў заснаваны графам Аляксеем Арловым, пасяленнях цыганоў на тэрыторыі Расіі. Аўтар звяртае ўвагу на адрозненні, якія існавалі ў рэгіёнах Расіі, у адносінах цыганоў з мясцовымі ўладамі. Галоўную прычыну ён бачыць у сацыяльна-эканамічным стане розных тэрыторый Расійскай імперыі. Так на „ўскрайку” — Закаўказзі, Малдавіі і на Украіне, дзе побач з эканамічнай адсталасцю існавала слабая адміністрацыя, цыганы адчувалі сябе вольна. Менавіта на гэтыя землі былі скіраваныя асноўныя шляхі міграцыі. У заходніх рэгіёнах — Фінляндыі і прыбалтыйскіх губернях „адносіны цыганоў з навакольнымі ўладамі і мясцовым насельніцтвам складваліся цяжка” (с. 33). У наступных главах аўтар спыняецца больш падрабязна на раскрыцці дадзенага тэзіса.

Даследчык звяртае ўвагу на ролю рэвалюцыйных падзей 1917 г. на лёс цыганоў. Часовы ўрад адмяніў распараджэнне Елізаветы Пятроўны 1759 г. і сенацкі ўказ „Аб забароне бадзяжным цыганам сяліцца ў сталіцы і іншых буйных гарадах”. Некаторыя з цыганоў былі ўключаны ў падзеі Кастрычніцкага пераварота (менавіта такое азначэнне дае аўтар падзеям 25 кастрычніка 1917 г.) і грамадзянскай вайны. Адны з іх былі на баку бальшавікоў, другія — сталі эмігрантамі. Лёс апошніх, якія апынуліся ў Югаславіі, Францыі, Марока, патрабуе спецыяльнага даследавання. Для простых людзей ліхалецце першых гадоў савецкай улады было

спрыяльным часам. Новай уладзе было не да іх і „для табарных цыганоў надышлі лепшыя часы" (с. 34).

Найбольш змястоўнай з'яўляецца трэцяя глава „З Расіі ў СССР (Вандроўныя будаўнікі сацыялізму: 1917-1991)". Пасля першых гадоў выпрабаванняў, новая ўлада звярнулася да цыганскага пытання ў 1924 г., калі быў заснаваны Усерасійскі савет цыганоў. Падобны саюз быў заснаваны (аднак афіцыйна не зацверджаны) у БССР.

Аўтар звяртае ўвагу на такую акалічнасць, як імкненне савецкага ўрада ў агітацыйнай працы праводзіць паралель паміж яўрэямі і цыганамі. Дадзены тэзіс на жаль не падмацоўваецца канкрэтнымі спасылкамі на дакументы. Гісторык сам гаворыць аб гэтым недахопе: „канкрэтныя інструкцыі на гэты конт да нас не дайшлі, і аб іх існаванні можна толькі здагадвацца" (с. 37). Цытаты з газет кшталту „яўрэйскае і цыганскае насельніцтва неабходна ўцягваць у вытворчасць" не могуць служыць доказам. На наш погляд, у дадзенай цытаце адзначаецца агульнасць існаваўшай праблемы — прадстаўнікоў абодвух народаў было мала ў вытворчай сферы, і не адзначаюцца паралелі ў іншых аспектах (падобнае параўнанне было б некарэктным).

Значная ўвага звяртаецца на праблему прыцягнення цыганоў да працы шляхам надзялення іх зямлёй, праблему, якую спрабаваў вырашыць яшчэ Мікалай I (указ 1839 г. „Аб забароне бадзяжніцтва і прымусовым рассяленні цыганоў на свабодных землях"). Новая ўлада пайшла па шляху аб'яднння цыганоў у калгасы. Вось тут аўтар згадвае аб існаванні цыгана-яўрэйскіх калектыўных гаспадарак. Можна адзначыць яшчэ адну паралель — абодва народы не імкнуліся да працы на зямлі. Вось толькі прычыны былі розныя...

Знаёмячыся з далейшым зместам главы і памятаючы пра параўнанне цыганоў і яўрэяў, заўважаем і іншыя падабенствы: шавінізм, прапрацоўка пытання аб стварэнні адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі для засялення прадстаўнікамі дадзенага народа (Бірабіджан для яўрэяў і пасёлак Раманістан для цыганоў).

З нацыянальнымі цыганскімі арцелямі, кааператывамі, калгасамі савецкая ўлада скончыла ў 1937-1938 гг. Гэта адпавядала агульнаму накірунку нацыянальнай палітыкі — да гэтага часу былі ліквідаваны падобныя інстытуты і іншых нацыянальнасцей. Трохі пазней аўтар адзначае, што прытрымліваецца меркавання, „што цыганскія калгасы былі разбураны не дырэктыўнымі пастановамі, а вайною і іншымі натуральнымі арганізацыйнымі цяжкасцямі, бо ніякіх афіцыйных дакументаў аб роспуску ці расфарміраванні цы-

ганскіх калгасаў не было” (с. 68).

Значную ўвагу даследчык звяртае на асвятленне пытання развіцця асветы сярод цыганоў. Ён прыводзіць факты развіцця выдавецкай справы, станаўлення літаратуры на роднай мове, дзейнасці школ і клубаў, самадзейных музычных, спеўных і тэатральных калектываў, падрыхтоўцы кадраў цыганскай інтэлігенцыі.

„Кароткі перыяд першай культурнай рэвалюцыі ў цыганскім асяроддзі” скончыўся ў 1938 г. (с. 56). Гэта было зноў жа ў рэчышчы агульнай нацыянальнай палітыкі — 24 студзеня 1938 г. выйшла сакрэтная запіска „Аб ліквідацыі нацыянальных школ і нацыянальных аддзяленняў у школах”.

Асобны этап у гісторыі цыганоў СССР звязаны з Другой сусветнай вайной. Аўтар згадвае аб высылцы на Калыму цыганоў з тэрыторый Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якія ўвайшлі ў склад СССР; фактах дэпартацыі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

У сувязі з падзеямі апошняй вайны неабходна згадаць аб генацыдзе акупацыйных улад адносна цыганоў. Гэты тэрмін трывала асацыіруецца з лёсам яўрэяў. Трагедыя цыганоў застаецца малавывучанай. У рэцэнзаванай кнізе аўтар, звяртаючыся да нямецкіх даследаванняў і дакументаў, малюе карціну трагічнага лёсу народа.

Не засталіся па-за ўвагаю гісторыка і гераічныя старонкі — распавядаецца пра Герояў Савецкага Саюза цыганскай нацыянальнасці.

Пасляваенная гісторыя цыганоў на прасторах СССР мае факты спробаў стварэння цыганскай аўтаноміі (на гэты раз у Малдавіі), новых намаганняў па „прыцягненню да працы цыганоў, якія займаюцца бадзяжніцтвам” (указ Прэзідыума ВС СССР 1956 г., які амаль паўтараў царскія ўказы), антыцыганскіх істэрыяў і аблаваў і „грэблівай абыякавасці савецкай улады да лёсу цыганоў”. У выніку „к пачатку 50-х гадоў на тэрыторыі Савецкага Саюза сфарміравалася цэлае пакаленне цыганскай моладзі, якое вырасла ва ўмовах табару і было прыстасавана да асаблівасцяў савецкай улады. Гэтыя маладыя людзі ў сваёй большасці не наведвалі школу, аднак часам вучыліся грамаце самастойна. (...) У мясцовыя школы цыганскіх дзяцей не бралі з прычыны іх часовага знаходжання. (...) Гэта былі людзі, якія выраслі ў экстрэмальных умовах, аднак вясёлыя і жыццярадасныя” (с. 74). Такі стан рэчаў не перашкодзіў з’яўленню ў цыганскім асяроддзі вядомых не толькі музычных і танцавальных калектываў, але і літаратараў, дактароў, мастакоў і г.д. Некаторае ажыўленне грамадскага жыцця дадзенага народа адбылося з пачаткам перабудовы, а 90-я гады

XX ст. былі дастаткова пладавітымі для развіцця культуры і адукацыі цыганоў.

Найбольш цікавай для беларускага чытача з'яўляецца чацвёртая глава „Цыганы Беларусі”. Яе структура падобная да папярэдняй. Аўтар асвятляе пытанні з'яўлення цыганоў на нашых землях, заканадаўчых актаў Вялікага Княства Літоўскага адносна гэтага народа, характарыстыцы вобразу жыцця і заняткаў беларускіх цыганоў. Даследчык прыводзіць лічбы колькасці цыганскага насельніцтва ў чатырох беларускіх губернях у 1897 г., іх гаспадарчай дзейнасці, сямейнаму стану (толькі Мінская губерня), а таксама падае спіс найбольш вялікіх па цыганскім насельніцтве ўездаў Віцебскай губерні. У далейшым прыведзены лічбы па тэрыторыі БССР 1926 г. Дастаткова падрабязна разгледжана пытанне спробы стварэння ў Беларусі саюза цыганоў. Найбольшую цікавасць выклікае асвятленне дзейнасці цыганскіх школ, якіх з 1927 па 1938 гг. на Беларусі налічвалася „не менш за сем” (с. 91). Неабходна заўважыць, што звесткі, прыведзеныя па дадзенай праблеме, нідзе да гэтага не друкаваліся. Аўтар правёў карпатлівую працу ў архівах па пошуку інфармацыі. Гісторык звяртае ўвагу на той факт, што „акрамя ўласна цыганскіх школ існавалі пачатковыя школы для цыганоў, дзе навучанне вялося на рускай ці беларускай мове, аднак цыганская мова вывучалася як асобны прадмет” (с. 91). Асаблівасцю цыганскіх школ была іх арганізацыя па тыпе школ-інтэрнатаў. Аўтар спыняецца на выніках праверкі цыганскіх школ, якая была праведзена ў 1933 г. Падрабязна разглядаецца дзейнасць Грышкаўскай чатырохгадовай школы-інтэрната і яе дырэктара Васіля Мурачкоўскага. У 1938 г. адбыўся першы (і адзіны) выпуск школы-інтэрната. У лістападзе 1932 г. пры адной з віцебскіх школ ФЗН была арганізавана цыганская група.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны цыганскае насельніцтва Беларусі панесла значныя страты. Аўтар распавядае пра зверствы акупантаў адносна гэтага народа, пра існаванне двух канцэнтрацыйных лагераў для цыганоў — у Брэст-Літоўску і Уздзе. Усяго за гады вайны як на акупаванай тэрыторыі, так і на франтах, на думку аўтара, загінула каля сарака працэнтаў цыганскага насельніцтва Беларусі, якое на пачатку вайны налічвала каля сямі тысяч чалавек (с. 100). Асобна распавядаецца пра беларускіх цыганоў — удзельнікаў вайны. На жаль, аўтар не адзначае асаблівасцей палітыкі акупантаў. Цікаўных адрасуем да артыкула А. Фрыдмана, у якім ўдакладняецца дадзенае пытанне.

Цыганскае насельніцтва пасляваеннай Беларусі аднаўлялася боль-

шай часткай за кошт цыганоў, якія прыехалі сюды з іншых рэгіёнаў СССР (с. 102). Як і ва ўсім Савецкім Саюзе на іх лёс значны ўплыў аказаў указ 1956 г. Аўтар адзначае, што „ў Расіі, Літве і Эстоніі, у параўнанні з Беларуссю і Латвіяй, улады больш лаяльна адносіліся да цыганоў” (с. 102). Выкананне ўказу ў Беларусі зацягнулася да 1 студзеня 1958 г. Яно праходзіла ў асноўным з выкарыстаннем рэпрэсіўных мер. З 11 студзеня 1957 г. усе цыганскія дзеці прымусова накіроўваліся ў школы і школы-інтэрнаты, а таксама ў так званыя „класы выроўнівання”. „Аднак, гэта кампанія пачала губляць сваю сілу і к пачатку 70-х гадоў канчаткова заглохла” (с. 105). Толькі ў 1985 г. зноў вярнуліся да праблемы. У сакавіку 1985 г. Мінскі гарвыканкам прыняў рашэнне „Аб затрыманні асобаў цыганскай нацыянальнасці, якія займаюцца бадзяжніцтвам і гаданнем”.

Ініцыятыва адраджэння цыганскай асветы ў Беларусі ў 1980-1990 гг. належыць вядомаму цыганскаму пісьменніку, педагогу і асветніку Мікалаю Саткевічу. У 1989 г. ідэя стварэння цыганскіх класаў атрымала новае дыханне. Асабліва настойліва і актыўна ў гэтым напрамку працаваў Ф. Яновіч (Ромка — Леніно). У пачатку 90-х гадоў у краіне пачала сваю рэлігійна-місіянерскую дзейнасць Цыганская свабодная пяцідзесятніцкая місія з Фінляндыі. Значную працу па аднаўленні памяці ахвяр Халакосту і выплаце дапамог праводзіць цыганскае аб’яднанне „Рома”. У 2003 г. пад эгідай Беларускай секцыі Міжнароднага таварыства правоў чалавека разгарнула праваахоўную дзейнасць група цыганоў — юрыстаў.

У канцы главы аўтар прыводзіць статыстычныя даныя адносна колькасці цыганскага насельніцтва краіны ў 1979, 1989 і 2000 гг. За перыяд з 1989 па 2000 г. іх колькасць узрасла з 10,8 да 16,7 тысяч чалавек. Найбольшая колькасць іх пражывае ў Мінску і Гомельскай вобласці.

Змест дадзенай главы істотна дапаўняе дадатак 1, у якім разглядаецца этнічны склад цыганскага насельніцтва Беларусі, яго ўзаемасувязі з цыганамі Паўночнай і Усходняй Еўропы. У ім аўтар дае тлумачэнне значнаму павелічэнню лічбы цыганоў у краіне за перыяд з 1989 па 2000 г. На яго думку, гэта звязана са значнай эміграцыяй з краін Балтыі і Сярэдняй Азіі. У дадатку прыведзена схема арэалу функцыянавання цыганскіх гаворак і карта цыганскіх дыялектаў і гаворак Еўропы. Выдзелены наступныя групы цыганоў Беларусі: „мінчане”, „бежанцы”, „ліпенцы”, „пінчукі”, „бернікі”, „гомельцы”, „полесякі”, „сінякі”. Аўтар вядзе гаворку на канкрэтных прыкладах аб агульнасці паўночных дыялектаў і запазычаннях з беларускай лексікі, якія назіраюцца ў га-

ворках цыганоў не толькі Беларусі, але і Літвы, Польшчы, Эстоніі, Латвіі.

Пятая глава прысвечана гісторыі цыганоў Балтыі (Літвы, Латвіі, Эстоніі). Аўтар па чарзе асвятляе лёс гэтага народа ў трох краінах на працягу дваццатага стагоддзя, а таксама характарызуе сённяшняе становішча.

У апошніх дзвюх главах прадстаўлены кароткі нарыс гісторыі цыганоў Польшчы і Фінляндыі. Цікава, што аўтар згадвае аб абмене насельніцтвам паміж СССР і ПНР 1955-1957 гг. Дадзеная праблема яшчэ чакае свайго асвятлення беларускімі гісторыкамі. Чытач даведваецца, што ў Польшчы, як і СССР, прадпрымаліся захады „па каардынацыі дзейнасці па пераходу цыганоў да аселага ладу жыцця і іх грамадска-карыснай працоўнай дзейнасці” — рэзалюцыя МУС ПНР 1964 г. (с. 131). Найбольшага прагрэсу ў пытанні практычнага вырашэння разнастайных праблем цыганоў дасягнула Фінляндыя, у якой з 1956 г. дзейнічае кансультацыйны савет па цыганскіх пытаннях пры Міністэрстве сацыяльных спраў і здароўя, і з 1992 г. — Цыганскі адукацыйны інстытут.

Каштоўнасць дадзенага даследавання павялічваецца значным ілюстрацыйным матэрыялам (звыш сарака здымкаў), прыведзенай храналогіяй гісторыі цыганоў пачынаючы з 204 г. і цыганскім біяграфічным слоўнікам (утрымлівае звыш 1 000 пазіцый). У бібліяграфіі — кнігі на цыганскай, англійскай, нямецкай, рускай, украінскай і беларускай мовах, спасылкі на архіўныя матэрыялы.

Нягледзячы на тое, што аўтар крануў, па яго ўласных словах, „толькі вяршыню айсберга”, кніга атрымалася вельмі цікавай. Яна — першае выданне на Беларусі комплекснага агляду гісторыі цыганоў. Спадзяемся, што ў далейшым дадзеная тэма прыцягне ўвагу як грамадскасці, так і іншых даследчыкаў.

**Дзмітрый Крывашэй**
(Мінск)